# СВЯТА БЕЛАРУСКАЙ ПРАЛЕТАРСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ

(Да пяцігоддзя з дня заснавання „Маладняка")

Адна з найбольш вялікіх эпох у жыцці чалавецтва--эпоха Кастрычніка--дала поўную мажлівасць працоўным розных нацыянальнасцей былой "расійскай імперыі" будаваць сваю гаспадарку і культуру.Дзіцем Кастрычніка з"яўляецца і Савецкая Беларусь.

Беларусь, толькі як Савецкая, змагла стала і шырока разгарнуць развіццё беларускай культуры і навукі.Калі азірнуцца і глянуць на тыя дасягненні,якія маюцца ўжо ў Савецкай Беларусі, мы цвёрда і гучна павінны заявіць,што мы хуткімі крокамі рушым па шляху да пастаўленай мэты,захопленыя дынамікай сацыялістычнага будаўніцтва.

Пяцігоддзе існавання "Маладняка"--адзін з буйнейшых фактараў нашага росту,адзін з характэрнейшых доказаў нашай мажлівасці стварыць у Савецкай Беларусі беларускую пралетарскую літаратуру.

"Маладняк" нязрушна стаіць на гэтым адказным шляху і ўсю сваю літаратурна-грамадскую дзейнасць накіроўвае да стварэння беларускай пралетарскай літаратуры.Таму "Маладняк" і з"яўляецца такой папулярнай літаратурнай арганізацыяй сярод рабоча-сялянскай моладзі.

Успомнім у дзень пяцігоддзя найбольш характэрныя этапы ў жыцці "Маладняка".

Першы этап--гэта этап літаратурнай рэвалюцыі, этап "Вайскорага камунізма".

За вельмі кароткі тэрмін "Маладняк" стаў вялікай арганізацыяй,злучаючы ў сваіх шэрагах да пяцісот таварышаў.Надзвычайная роля і значэнне "Маладняка" менавіта і былі ў тым, што ён выяўляў маладыя творчыя сілы і дапамагаў ім у іх раз-

віцці,ідэалагічна іх выхоўваў.Ва ўсіх акруговых гарадах засноўваліся філіі "Маладняка",у раёнах,вёсках,пры школах вырасталі маладнякоўскія гурткі.І не толькі ў БССР.Меліся філіялы "Маладняка" ў Маскве,Ленінградзе і па-за межамі Савецкага Саюза."Маладняк" быў там,дзе была беларуская мова, дзе жылі беларусы,якія імкнуліся стаць у шэрагі будаўнікоў новага ладу,якія праглі сваю энергію і здольнасці аддаць працоўным,расці і выхоўвацца пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі.

Першы этап "Маладняка" вызначаўся тым,што не толькі стаялі задачы выяўлення новых творчых сіх і выхавання іх,але і ў тым,што праца "Маладняка" шчыльна ўвязвалася з барацьбой пралетарыята,з палітычнай працай,з працай і барацьбою камуністычнай партыі.

Маладняковец з творчым запалам у грудзях быў актыўным агітатарам за беларускую мову і культуру,ён дапамагаў распаўсюджванню беларускага друку.

Сваёй літаратурнай творчасцю маладнякоўцы паклалі пачатак новаму перыяду ў гісторыі беларускай літаратуры.Матывы грамадскага жыцця,энтузіязм,захапленне барацьбою і перамогаю рабочага класа,прасякнутыя рэвалюцыйным пафасам,--вось у асноўным галоўная тэматыка маладнякоўцаў у першы перыяд іх творчай працы.

Масавае даступнае выданне маладнякоўскай творчасці /кніжніца "Маладняк"/ адыграла вялікую ролю ў справе выхавання чытача беларускай савецкай літаратуры,пачаткам развіцця якой і была маладнякоўская творчасць.

Уся гэтая вялікая праца праводзілася шляхам выездаў у акругі і раёны нашай рэспублікі,шляхам дыспутаў,літаратурных

выступленняў і выданнем у акругах спецыяльных брашур /Клімавічы/ і газетных лістовак /Віцебск,Бабруйск,Гомель/.

Але трэба адзначыць,што ў буйнай маладнякоўскай творчасці, поруч з вялікім запалам,захапленнем,маладой энергіяй, нагладалася даволі беднае мастацкае афармленне."Маладняк" імкнуўся заняць дамінуючае становішча ў беларускай літаратуры,часта ідучы "ў рожкі са старымі".Пытанні фармальна-мастацкага парадку былі ў пэўнай меры ў загоне.Але гэта толькі першы перыяд.

"Далейшае пашырэнне і паглыбленне сацыялістычнага будаўніцтва Савецкай Беларусі патрабуе і ад "Маладняка" паглыбленне сваёй працы.На гэты шлях "Маладняк" ужо ступіў", /А.Г.Чарвякоў/.

Другі этап "Маладняка"--паглыбленне і ўдасканаленне метадаў працы,пераход на мірныя рэйкі ўпартай працы пабудавання беларускай пралетарскай літаратуры.

Новыя абставіны будаўніцтва краіны выклікаюць і новыя абставіны літаратурнага жыцця.Паляпшаецца дабрабыт рабочых і сялянскай беднаты,вырастаюць і больш культурныя запатрабаванні.Адсюль і задача "Маладняка":даваць такую прадукцыю,якая б задаволіла гэтыя запатрабаванні.

Поруч з паляпшэннем умоў жыцця і працы рабочых і бяднейшага сялянства, вынікае і класавае распластаванне як у горадзе, так і ў вёсцы.І ў"Маладняку" немінучы быў працэс дыферэнцыяцыі.Частка маладнякоўцаў пакінула аб"яднанне,стварыўшы новую літаратурную групу."Гэты выхад з "Маладняка" часткі пісьменнікаў азначаў сабою суб"ектыўна капітуляцыю перад цяжкасцямі перагрупавання арганізацыйных і творчых сіл,перад цяжкасцямі пераходу на новыя,больш цяжкія,хоць мо і больш спакойныя,

пазіцыі; аб"ектыўна--адыход ад правільнай лініі ў справе будавання беларускай пралетарскай літаратуры" /ад усебеларускага аб"яднання "Маладняк". "Савецкая Беларусь",№271,1926г./.

Маладнякоўцы паставілі сабе задачай працаваць над сваім развіццём,вывучаць жыццё,праявы класавай барацьбы,узбагачаць сваю творчасць рознастайнасцю пралетарскага зместу,удасканальваючы сваю нацыянальную форму.У сваіх фармальна-мастацкіх шуканнях маладнякоўцы акунуліся ў беларускую народную творчасць,пачалі вывучаць творчасць старэйшых беларускіх пісьменнікаў,пачалі даследаваць культурныя дасягненні папярэдніх эпох,бо "толькі дакладным веданнем культуры,створанай усім развіццём чалавецтва,толькі перапрацоўкай яе можна будаваць пралетарскую культуру" /Ул.Ленін/.

Гэты своеасаблівы культурны паход "Маладняка" даў ужо вынікі.Мы сёння можам канстатаваць пашырэнне тэматыкі,больш высокую якасць фармальна-мастацкага афармлення.Сёння мы наглядаем пераход ад лірычных вершаў,ад навел да эпічных твораў--паэмы і рамана.

Трэці этап у гісторыі "Маладняка" вызначаецца пераходам М.Чарота,М.Зарэцкага,А.Дудара,А.Вольнага і А.Александровіча ў аб"яднанне "Полымя".Ініцыятыва,арганізацыйная праца пачала праводзіцца новымі,выяўленымі ў "Маладняку",сіламі.

Частка маладнякоўцаў,якая стварыла аб"яднанне "Пробліск", неўзабаве вярнулася назад у "Маладняк". Да "Маладняка" далучыліся некаторыя таварышы з "Літаратурна-мастацкай Камуны".Праз увесь час выходзіць часопіс "Маладняк".

Вось найбольш характэрныя моманты маладнякоўскага жыцця за пяць гадоў.Цяпер "Маладняк" уваходзіць у новы, чацвёрты,

этап свайго існавання, ствараючы і новы этап у гісторыі беларускай літаратуры. "Маладняк" рэарганізуецца, змяняе метады сваёй працы, ствараючы Беларускую Асацыяцыю Пралетарскіх Пісьменнікаў.

Мяркуючы па настроях дэлегатаў другога маладняко̆ўскага з"езду /які цяпер адбываецца/, назва "Маладняк" застаецца, што, па нашай думцы, мае надзвычай важнае значэнне. "Маладняк" быў і застаецца сцягам барацьбы і творчасці, і пад гэты пралетарскі сцяг ідуць і будуць ісці новыя і новыя сілы--будаўнікі беларускай пралетарскай літаратуры.

Робячы такі адказны крок, як рэарганізацыя ў БЕЛАПП, "Маладняк" павінен праверыць і ідэалагічную якасць сваіх сяброў. Бясспрэчна, ёсць і цяпер яшчэ некаторыя маладнякоўцы, якія нічога агульнага не маюць з пралетарскай ідэалогіяй, нават не стаяць блізка да подступаў будавання беларускай пралетарскай літаратуры. А "Маладняк" павінен помніць, што асабліва ў наш час востра выпікае класавая барацьба, а таму "Маладняк" павінен адгарадзіць сябе ад якіх бы там ні было небяспек, упэўненымі крокамі ідучы да стварэння пралетарскай літаратуры.

Беларуская пралетарская літаратура будзе расці і паглыбляцца з ростам і паглыбленнем агульнага сацыялістычнага будаўніцтва нашай краіны. Беларуская літаратура яшчэ адстае ад дынамікі будаўніцтва. Таму трэба стварыць літаратарам належныя ўмовы працы, што часамі мае рашучае значэнне ў працэсе развіцця творчасці.

"Безумоўна, камуністычная партыя мае ўсе падставы для таго, каб аб"яднанне "Маладняк" паставіць ў найбольш спрыяючыя

для яго развіцця ўмовы, бо "Маладняк"--гэта той кадр, з якога будзе вылучана надзейная змена, загартаваныя будаўнікі пралетарскай літаратуры". /З прывітальнага слова сакратара ЦК КП/б/Б тав. Васілевіча на адкрыцці з"езда/.

Трэба адначасова завастрыць цяпер пытанне адносна вучобы маладнякоўцаў.

Гэта, вядома, нікольні не ўзнімае небяспекі, што пісьменнік адарвецца ад мас, ад будаўніцтва, як ад крыніцы, адкуль ён павінен браць матэрыялы для сваёй творчасці, а наадварот, гэта забяспечыць павышэнне мастацкай якасці. Літаратура будзе зброяй класавай барацьбы толькі тады, калі яна будзе мастацкай, калі яна будзе арганізоўваць пачуцці чытача.

Гэтыя пытанні сучаснага літаратурнага жыцця ў дзень пятай гадавіны "Маладняка" мы лічым патрэбным узняць і падкрэсліць, каб хутчэй вырашыць тыя задачы, якія павінна ставіць перад намі будучыня.

А задачы вельмі вялікія. Не павінен астыць рэвалюцыйны пафас творчасці, а шугавейна шырыцца і шырыцца.

Пяць год існавання "Маладняка" і яго плённая творчая праца з"яўляюцца найлепшай парукай таму, што надзеі, ускладзеныя на "Маладняк" камуністычнай партыяй і рабочым класам, будуць выкананы.

Далейшае існаванне "Маладняка"--гэта далейшы шлях стварэння ў Савецкай Беларусі беларускай пралетарскай літаратуры.

1928

Цяпер 1990 крытыка мае толькі гісторыка-літаратурны цікавасць.